Аддзел адукацыі, спорту і турызму Гомельскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Маркавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа”

XIV раённая навукова-практычная канферэнцыя вучняў
“Першыя крокі ў навуку”

Вучэбна-даследчая работа

# Жаночы сялянскі касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа на пачатку XX стагоддзя

Выканалі:
вучаніца 11 класа — Шыпкова Вольга Уладзіміраўна,
вучаніца 11 класа — Бірулёва Ірына Міхайлаўна

Кіраўнік:
настаўнік геаграфіі — Герасенка Марыя Аляксандраўна

Маркавічы 2014

**Змест**

Уводзіны ... 3
Глава 1. Агляд літаратуры ... 5
Глава 2. Месца і метады даследавання ... 6
2.1. Месца даследавання ... 6
2.2. Метады даследвання ... 6
Глава 3. Вынікі даследавання ... 7
3.1. Тканіны для адзення ... 7
3.2. Нацельнае адзенне – сарочка ... 7
3.3. Паясное адзенне ... 9
3.4. Наплечнае адзенне ... 10
3.5. Галаўныя ўборы і ўпрыгожванні ... 11
3.6. Верхняе адзенне і абутак ... 12
Заключэнне ... 14
Літаратура ... 16
Дадатак 1. Спіс інфарматараў: ... 17
Дадатак 2. Жаночы сялянскі касцюм у пачатку XX стагоддзя ... 18
Дадатак 3. Асноўныя элементы жаночага сялянскага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа ... 19
Дадатак 4. Тэхналагічная карта экскурсіі “Жаночы сялянскі касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа” ... 30

**Уводзіны**

Адной з важнейшых этнічных прыкмет з'яўляецца народнае адзенне – адна з важнейшых частак матэрыяльнай культуры. З глыбокай старажытнасці і на працягу ўсяго існавання народны касцюм задавальняў не толькі матэрыяльныя, але і духоўныя патрэбы чалавека, выконваючы неабходныя бытавыя, сацыяльныя і абрадавыя функцыі. У святочным і абрадавым адзенні адлюстравалася само жыццё селяніна, яго светапогляд, адносіны да людзей. Традыцыўны касцюм – невычэрпная крыніца натхнення для сучасных дызайнераў адзення, прадмет уважлівага вывучэння этнографаў. Даследуючы народны касцюм, можна меркаваць аб гістарычным шляху народа, яго ўяўленнях аб прыгажосці, аб акаляючым свеце і сваім месцы ў ім.

Найбольшай разнастайнасцю прыёмаў і відаў ткацтва, народнага касцюма характарызуюца раёны суседства этнасаў, дзе адбываецца ўзаемапранікненне і абагачэнне культуры кожнага народа. Прычым, у кожнай мясцовасці былі свае асаблівасці як прыёмаў ткацтва, так і крою адзення, ўпрыгожвання тканых вырабаў. Пры пэўнай аднатыпнасці беларускі народны касцюм мае свае адметныя асаблівасці ў кожнай мясцовасці, нават у межах аднаго гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна.

Найбольш яскравая і пераканальная частка рукатворнай спадчыны – гэта жаночы касцюм, у якім найбольш ярка і поўна ўвасабляецца народнае майстэрства і фантазія. Трэба адзначыць, што і большасць выяўленых элементаў народнага касцюма адносіцца да жаночага адзення.

На жаль, багатыя традыцыі ткацтва, вышыўкі, народнага адзення беззваротна знікаюць ў наш час, калі ўсё менш застаецца носьбітаў традыцыйнай культуры. Народны касцюм выйшаў з абіходу і запатрабаваны толькі на фальклорных святах. Работнікі музеяў, інстытутаў этнаграфіі сутыкаюцца з тым, што ўсё цяжэй становіцца збіраць, вывучаць і сістэматызаваць узоры народнага адзення.

Разнастайнасць варыянтаў дае ўяўленне аб багацці талентаў, творчым патэнцыяле нацыі. Мець уяўленне аб касцюме сваёй мясцовасці не проста цікава, але і неабходна, тым больш, што элементы народнага касцюма можна выкарыстоўваць для вырабу адзення толькі для фальклорных калектываў, але і для паўсядзённага адзення. Пытанні выкарыстання этнічных асаблівасцей народнага касцюма зараз часта абмяркоўваюцца ў СМІ.

У сувязі з гэтым неабходна вывучаць, захоўваць і адраджаць забытыя традыцыі мастацтва свайго народа. Ведаць і зберагаць народную мастацкую культуру – гэта значыць зберагаць душу народа.

Таму мэта нашай работы: даследаванне асаблівасцей жаночага сялянскага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа на пачатку ХХ стагоддзя, захаванне культурнай спадчыны Гомельшчыны.

Задачы:
- сістэматызаваць і дапоўніць матэрыял аб элементах жаночага сялянскага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа;
- выявіць асаблівасці арнаментацыі і прыёмы вырабу дэкаратыўнага аздаблення жаночага касцюма мясцовасці;
- распрацаваць тэхналагічную карту экскурсіі “Жаночы сялянскі касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа”.

## Глава 1. Агляд літаратуры

Цікавасць да народнага касцюма ўзнікла ў XIX стагоддзі, калі даследчыкі мэтанакіравана пачалі збіраць звесткі аб народах Расійскай імперыі, іх матэрыяльнай і духоўнай культуры. Не засталося без увагі і адзенне. У канцы XIX – пачатку XX ст.ст. было арганізавана некалькі экспедыцый па Паўночна-Заходняму краю, у выніку якіх быў сабраны ўнікальны фотаматэрыял, які выклікае цікавасць і ў сучасных даследчыкаў [4]. Значны ўклад у вывучэнне адзення беларусаў унеслі А. Семянтоўскі, М.Я. Нікіфароўскі, П.В. Штэйн, Е.А. Раманаў. Нашу мясцовасць наведваў і апісаў у III томе “Маляўнічай Расіі” С.В. Максімаў[2].

Вывучэнне народнага касцюма працягвалася і ў савецкі час, асабліва ў другой палове XX стагоддзя. Найбольш значнымі былі працы М. Раманюка [9,10], Л.А. Малчанавай [8], Курыловіч А.Н. [5], этнаграфічныя даследаванні, якія вяліся інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору пад кіраўніцтвам В.К. Бандарчыка. У гэтых працах падрабязна апісваюцца элементы народнага касцюма, іх бытаванне на тэрыторыі краіны, вылучаны і ахарактарызаваны народныя строі.

Даследаванні лакальных асаблівасцей народнага адзення працягваюцца і ў наш час. Найбольш значнымі ў гэтым плане з’яўляюцца працы Л.І. Маленка [7], даследаванні палескага рэгіёна вяліся Віннікавай М.М.[1]. Тэхналогія крою, аздаблення народнага касцюма падрабязна разглядаецца ў працах В.А. Лабачэўскай, З.І. Зіміной [3]. Народны касцюм Гомельшчыны, у прыватнасці, Гомельскага раёна даследуецца ў работах А.В. Кузміч [4]. Супрацоўнікі лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры вывучалі агульныя асаблівасці народнага касцюма нашай мясцовасці [11], але разнастайнасць элементаў жаночага касцюма, асаблівасці аздаблення, яго сімволіка патрабуе больш падрабязнага вывучэння.

## Глава 2. Месца і метады даследавання

### 2.1. Месца даследавання

Даследванні праводзіліся ў паўднёва-ўсходняй частцы Гомельскага раёна, у вёсках Маркавічы, Гадзічава, Краўцоўка, Глыбоцкае, Чарацянка, Макаўе (Дадатак 2). Гэта тэрыторыя на поўдні мяжуе з Чарнігаўскай вобласцю Украіны, на ўсходзе – з Добрушскім раёнам, які ў сваю чаргу мяжуе з Бранскай вобласцю Расіі.

У гісторыка-этнаграфічных адносінах, вывучаемы рэгіён адносіцца да Падняпроўя, дзе гістарычна сутыкнулася культура крывічоў, радзімічаў, севяран. Менавіта ў гэтай частцы Падняпроўя найбольш актыўна адбываліся этнагенетычныя працэсы.

Вёска Маркавічы на пачатак XX стагоддзя адна з самых з буйных вёсак мясцовасці, цэнтр воласці, да якой адносіліся вышэй названыя вёскі. Насельніцтва вёскі Маркавічы, Гадзічава і іншых праваслаўнага веравызнання. На пачатаку XX ст. у в.в. Маркавічы і Гадзічава дзейнічалі дзве праваслаўныя царквы (пабудаваныя ў 1729 і 1822 гг.), 2 яўрэйскія малітоўныя дамы, так як радам знаходзілася ўкраінскае мястэчка Дабранка. Гэта абумоўлена тым, што сяло мела развітае эканамічнае жыццё – у канцы XIX ст. зафіксавана 20 лавак, 5 ветраных млыноў, насельніцтва займалася бандарствам, кравецтвам, сталярствам. Традыцыйна ў весках рэгіёна, акрамя земляробства і жывёлагадоўлі, насельніцтва займалася адыходніцтвам, разнастайнымі промысламі і рамёствамі, сярод якіх абавязкова было кравецтва і шавецтва. Такім чынам, касцюм весак лакальнага рэгіёна ў канцы XIX – пачатку XX стст. развіваўся ва ўмовах дастатковай эканамічнай стабільнасці, хуткага роста насельніцтва.

Праз населеныя пункты праходзіў так званы “Кацярынінскі шлях”, які звязваў паўночныя раёны Расіі з поўднем Украіны.

### 2.2. Метады даследвання

Матэрыял збіраўся шляхам апытання мясцовых жыхароў і наведвання школьных музеяў маршрутным і стацыянарным метадам. Стацыянарным метадам
вывучаўся матэрыял у в.в. Маркавічы і Гадзічава, у іншых вёсках маршрутным.

**Глава 3. Вынікі даследавання**

## 3.1. Тканіны для адзення

Асноўным матэрыялам для вырабу адзення на пачатку XX стагоддзя ў нашай мясцовасці з'яўлялася даматканае ільняное палатно, сукно і паўсукно (шарсцяная і паўшарсцяная тканіна), пазней пашырылася выкарыстанне фабрычных тканін.

Для асноўнага адзення - сарочкі выкарыстоўвалася палатно, тканае на дзвюх нітах (палатнянае перепляценне). Для верхняй часткі выкарыстоўвалася тонкае кужэльнае палатно, для ніжняй грубае, абдзеркавае (Дадатак 3, мал.5).

Асобая ўвага надзялялася тканіне, з якой шыліся рукавы. Гэта тканіна адрознівалася багаццем арнаменту і выконвалася пераважна бранай тэхнікай, пазней вышывалася. Арнамент быў звычайна геаметрычны, палосы размяшчаліся гарызантальна, рытмічна чаргаваліся з белымі незатыканымі палоскамі. Для тканых узораў выкарыстоўваліся пераважна ніткі чырвонага колеру.

Для паяснога адзення - спадніц і андаракаў выкарыстоўваліся льняныя, суконныя і паўсуконныя тканіны. Андарак і спадніцы ткаліся пераважна рэмізнай тэхнікай на дзвюх нітах. Андарак ткаўся з воўны з дабаўленнем ільняной ніткі. Па ўзору можна падзяліць андаракі на тры тыпы: самы лёгкі від ткацтва “у палоску”, затым “у клетку” і характэрны для нашай мясцовасці чырвоны андарак з вытканым або вышытым працягам па падоле рознакаляровым ўзорам. Палоскі размяшчаліся вертыкальна, вядучым колерам быў чырвоны. Клетчаты андарак быў чырвоны з сінім або чорным ці наадварот, сустракаліся і чырвона – белыя андаракі. Святочныя андаракі былі чырвоныя, ніз вытыкаўся пераборнай тэхнікай з выкарыстаннем рознакаляровых нітак або вышываўся працягам.

## 3.2. Нацельнае адзенне – сарочка

У тыповы комплекс жаночага адзення ўваходзілі сарочка, спадніца (або спадніца з нагруднікам, або андарак), гарсэт – “ушварка”, фартух, хустка. Жаночы касцюм ствараў стройны, выцягнуты па вертыкалі сілуэт, доўгі андарак разам з прамым фартухом, павялічваў аб'ём ніжняй часткі касцюма, плотна аблягаючы стан карсет відавочна памяньшаў верхнюю частку фігуры (дадатак 2, 3,мал.1-13) .

Найважнейшая часка адзення – сарочка, якую насілі ў любым узросце, сацыяльным становішчы, у будні і святочны дзень. Для сарочак нашай мясцовасці характэрны полікавы крой з плечавымі ўстаўкамі (палікі – устаўкі прамавугольнай формы паміж пярэдняй і задняй полкамі). Вылучаюцца святочная і будная сарочкі, якія некалькі адрозніваюцца кроем і аздабленнем.

Будная сарочка менш упрыгожвалася, шылася з больш грубага палатна. І святочная і будная заўсёды складаліся з дзвюх частак: верхняя шылася з больш якаснага палатна і багата ўпрыгожвалася, а ніжняя - з грубага абдзеркавага палатна, называлася "подтычка" і рэдка аздаблялася вышыўкай. Па меры зносу ніжняя частка замянялася на новую. Радзей шыліся суцэльныя сарочкі – вясельныя або святочныя сарочкі, якія адзяваліся пад плахту (панёву).

Даўжыня сарочкі была розная. Пад спадніцу з нагруднікам яна была даўжэй, бо існавала павер'е, што калі сарочка была відная на палец, то не бралі ўрокі. А пад андарак сарочка была больш кароткай.

Сарочкі шылі з палікамі, доўгія, з цэльнымі палотнішчамі тканіны, ці з падточкай. Каўнер - стойку упрыгожвалі сціплай вышыўкай. Дастаткова шырокі рукаў злучаўся з палiком мярэжкай з чырвоных, чорных, белых нітак. Насычаны, плотны геаметрычны арнамент быў размешчаны на паліку і ўверсе рукава. Рукаў унізе сабраны пад шырокі манжэт. Падол быў упрыгожаны нешырокім вышытым бардзюрам з нескладаным геаметрычным арнаментам.Асноўныя месцы ўпрыгожвання сарочкі – рукавы з манжэтам і каўнер. Вядучыя прыёмы ўпрыгожвання – вышыўка і мярэжка, моршчанне, радзей сустракаецца гафтаванне, раней быў пашыраны затыканы бранай тэхнікай рукаў. Мярэжка размяшчалася ў верхняй частцы рукава, па ёй рабілася вышыўка. Таксама прыгожа аздабляліся стыкі плечавых уставак. Найбольшае майстэрства і фантазію ў выкананні ўзору жанчыны праяўлялі ў аздабленні вонкавай часткі рукава. Узор размяшчаўся як уверсе, так і расшываўся ўвесь рукаў. Вышыўка ажыццяўлялася ў чырвона-чорнай гаме (дадатак 3, мал. 6-14).

Манжэты аздабляліся вышыўкай, зборкай, карункамі, дэкаратыўнымі краявымі швамі (абкіданне, зубленне), вышыўкай на зборках (дадатак 3, мал. 24-26). Каўнер-стойка небагата ўпрыгожваўся вышыўкай крыжыкам, нацягам, вытыкаўся бранай тэхнікай (дадатак 3, мал. 27-29). У некаторых сарочках сустракаецца вышыты папярочны або прадольны ўзор на ніжняй частцы. Калі падтыкаўся андарак або спадніца, быў бачны ўзор. Магчыма, гэта мела нейкі магічны сэнс для захавання здароўя жанчыны. Трэба адзначыць, што асаблівасці вышыўкі на рукаве не ўказвалі замужам жанчына ці не, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, дзе па асаблівасцях вышыўкі гэта можна было сказаць.

Ужо ў пачатку XX ст. былі шырока распаўсюджаны сарочкі паліковага крою з шырокімі рукавамі, высокім каўняром-стойкай. У такіх сарочках адсутнічалі мярэжкі, месца злучэння паліка і рукава адзначалася плотным вузкім вышытым бардзюрам ў выглядзе гірлянды з кветак, сцяблін і лісця. На асноўнай часцы рукава былі размешчаны вышытыя крыжыкам чырвонымі і чорнымі ніткамі разрэжаныя гірлянды і букеты кветак, што і дало назву такім сарочкам "сарочкі кветкамі" або "кветкі". Хаця нярэдка акрамя кветак вышываліся галінкі вінаграду, суніцы. З кветак часцей вышываліся ружы і васількі. Трэба адзначыць, што ў гэты час у вышыўцы пераважаюць так званыя "бракараўскія" узоры (дадатак 3, мал.15-17). Сустракаюцца экзэмпляры і з

геаметрычным узорам, вышытым адвольнай ці лікавай гладдзю ці крыжыкам. Такая яркасць і насычанасць упрыгожвання рукава характэрна і для Чарнігаўшчыны.

У касцюме манжэт падцягваўся як мага вышэй па руцэ, шырокі рукаў сарочкі ствараў напуск, выяўляючы свой аб'ем і дэманструючы элементы вышыўкі. Змянілася афармленне края рукава. Замест шырокага гладкага манжэта сталі рабіць "брыжы" – аборку унізе рукава, якая апрацоўваўся краявым пецельным швом чырвонымі і чорнымі ніткамі. Такая аборка ўтваралася пры зборцы самога рукава на адлегласці 5-7 см ад краю. Паверх зборак пазней прышывалі паласу тканіны з вышыўкай, а да гэтага была пашырана вышыўка на зборках. Магчыма, шырыня рукава паўплывала у нейкай ступені на ўзнікненне шытва па зборках. Геаметрычны арнамент такіх вышывак надзвычай вытанчаны, ураджвае тонкасцю выканання і узроўнем майстэрства вясковых майстрых. Разнастайнымі былі і самі зборкі, напрыклад, "вафлі", фестончатая зборка (пуплы) (дадатак 3, мал. 24-26).

### 3.3. Паясное адзенне

Да паяснога адзення жанчын мясцовасці адносіцца андарак, спадніца і спадніца з нагруднікам, фартух.

Андаракі ў даследаваных вёсках бытавалі даволі разнастайныя, што дэманструе вузкалакальныя традыцыі і вясковыя "моды", уплывы суседніх тэрыторый. Андаракі шылі з 4 полак ваўнянай даматканіны ў буйныя клеткі ці вертыкальныя палосы, дастаткова доўгія. Клятчастыя андаракі былі чорна-чырвоныя, радзей чорна-сінія, а таксама з перавагай чырвонага колеру у спалучэнні з бэзавым, жаўтаватым. Асноўны – чырвоны – колер паласатых андаракаў стрыманы, прыглушаны жоўтымі, зяленымі вузкімі паскамі, жаўтавата-серымі адценнямі небеленага лёну (дадатак 3, мал. 14-16). Сустракаюцца таксама зусім не характэрныя для трыторыі Беларусі андаракі – чырвоныя, з шырокімі палосамі буйнога рознакаляровага арнаменту па падолу, распаўсюджаныя на Чарнігаўшчыне. Такія андаракі, якія належалі іх бабулям і прабабулям, мясцовыя жыхары называлі вянчальнымі. Шыўся андарак доўгі, каб закрываў "костачку". У колеравай гаме мясцовых андаракаў вядучым быў чырвоны колер. Таксама выкарыстоўваліся ніткі карычневага, жоўтага, белага і сіняга колеру (дадатак 3, мал. 1,2).

Андарак збіраўся ў складкі. Спераду на андарак адзяваўся фартух. На некаторых андараках па гэтай прычыне спераду ўзор не вытыкаўся. На андарак "у палоску" і "клетку" завязваўся фартух з белага палатна або фабрычнай тканіны з вышытым узорам. А для чырвонага андарака фартух ткаўся з такой жа тканіны з падобным затыканнем унізе. Дадаткова ён вышываўся ўзорам, характэрным для паўднёва-усходняй часткі Беларусі, а таксама і для Чарнігаўшчыны.

У цёплую пару года часцей насіліся больш лёгкія і кароткія спадніцы, якія ў апошні час шыліся з фабрычнай тканіны. Пераважна спадніцы былі чырвонага колеру. Унізе яны аздабляліся рубчыкам, устаўкамі з тканіны іншага колеру. Спераду на спадніцу адзяваўся фартух (дадатак 3, мал. 7).

Адной з форм нясшытай спадніцы зрэдку адзявалася плахта (панёва), якая ўяўляла сабой кавалак тканіны, што завязваўся спераду. Звычайна плахту насілі замужнія жанчыны, ёй яны накрывалі дзяцей, каб не бралі ўрокі. Плахты у апошні час не ткаліся, а купляліся ў Чарнігаве (дадатак 3, мал. 10).

Для сталых жанчын больш характэрна такая форма адзення як спадніца з нагруднікам, якая ўключала ў сябе ліф – нагруднік і спадніцу і шылася з фабрычнай тканіны. Такая форма адзення часцей сустракаецца ва ўсходніх раёнах Беларусі. Яна была зручнай, бо зберагала здароўе жанчыны, асабліва ў час выкормлівання дзяцей.

Нагруднік мог адрозніваца колерам ад спадніцы. Спераду ён зашчапаўся. Унутраная частка нагрудніка шылася з ільнянога палатна (дадатак 3, мал. 8-11).

На спадніцу з нагруднікам таксама адзяваўся фартух. Ён меў дзве формы: закругленую і прамую. Па краю прышывалася кружава або фальбона (“брыж”). Фартух аздабляўся вышыўкай, кружавам, рубчыкам. На некаторых фартухах ззаду рабіліся больш доўгія канцы завязак, якія вышываліся. У адрозненні ад іншых раёнаў Беларусі фартух завязваўся і дзецям, як і на Украіне.

Фартух – абавязковая частка жаночага касцюма. Звычайна фартух шыўся прамавугольны з адной або двух полак. Фартух быў на 15-20 см карацей спадніцы. З распаўсюджваннем фабрычнай тканіны фартухі шылі ў адну полку. Даматканыя фартухі перасталі насіць са святочным адзеннем у пачатку ХХ ст., ім на змену прыйшлі белыя, з купленай тканіны (белы ці набіўны паркаль), з шырокім брыжом і вузкай палоскай вышыўкі па нізу фартуха, з устаўкамі тонкіх карункаў ці гафта. Фартух перажыў шэраг змяненняў: у 1910-20 гг. у модзе былі доўгія фартухі з нагруднікамі, якія шылі з купленых тканін – аднатонных ці набіўных, цёмныя і светлыя. Пазней з’явіліся больш кароткія фартухі са скругленым ніжнім краем і аборкай уздоўж яго. Мода на іх пратрымалася да 1960-х гг. Звычайна фартух быў белы, але сустракаўся шэры, чорны – запаска (дадатак 3, мал. 5, 10, 11).

Жанчыны насілі даволі шырокія (15-20 см) чырвоныя паясы з воўны, якія абвівалі вакол стану адзін раз, завязвалі з левага боку спераду, або паабодва бакі “у вушкі” з кіціцамі, але з ужытку яны канчаткова зніклі ў 1930-я гг.

### 3.4. Наплечнае адзенне

У камплекце з сарочкай і паясным адзеннем (спадніцай, андаракам) надзявалася
“ушварка” (безрукаўка). Гэты элемент запазычаны з еўрапейскага касцюма. Яе шылі з чорнай, сіняй, зялёнай крамнай тканіны. Яна мела цэльнакроеныя

пярэднія полкі, спінку, адразную па лініі таліі, да якой прышывалася баска, сабраная у 9-11 дробных сустрэчных складак.

Характэрнай асаблівасцю “ушваркі” былі падвоеныя складкі баскі, апрацоўка дэкаратыўнымі элементамі (аплікацыя, стужкі, дэкаратыўная строчка) не толькі проймы, выразу вората, але і ніжняга края і сярэдзіны пярэдніх полак безрукаўкі, магла мець карман. У бакавыя швы з унутранага боку ушывалі трывалыя льныя матузкі, якія завязваліся пад ушваркай спераду. Такі прыём дазваляў стварыць ідэальна строгую лінію спіны, без складак і маршчын, якая кантраставала з вельмі пышнымі складкамі баскі. Зашчапалася ушварка звычайна на кручкі “гаплікі”. Унутраная частка шылася, як і нагруднік,з палатна (дадатак 3, мал. 1-4, 5, 13).

## 3.5. Галаўныя ўборы і ўпрыгожванні

Завершанасць і святочнасць жаночаму касцюму надаваў галаўны ўбор. Дзяўчаты заплятаі косы, насілі вянкі, да якіх прывязвалі стужкі. Што характэрна больш да ўкраінскага касцюма. Жаночыя і дзявочыя прычоскі адрозніваліся ва ўсе часы. Валасы разбіралі на прамы прабор, спераду, з абодвух бакоў рабілі невялікі напуск на лоб. Дзяўчаты заплятаі адну касу, радзей дзве, упрыгожвалі стужкамі. Дзяўчаты старэйшага ўзросту маглі укладваць заплеценыя косы вянком накшталт жаночай прычоскі. Жанчыны не заплятаі косы: валасы, раздзеленыя на прамы прабор, скручвалі ў жгуты з дабаўленнем пасмаў лёну, укладвалі вянком на галаве. Такі прыём уклададання валасоў быў характэрна для Палесся і Украіны, што адзначалі даследчыкі традыцынага касцюма. Укладзеныя такім чынав валасы пакрывалі невялікім чапцом, сціпла упрыгожаным стухкамі. Трэба адзначыць, што чапцы як частку пахавальнага адзення старых жанчын шылі да сярэдзіны XX ст..
Жанчыны хавалі свае валасы пад чапец, бо лічылася, што косы прываблівають мужчын, а замужняй жанчыне гэта рабіць непрыстойна. На чапец больш сталымі жанчынамі завязвалася хустка (дадатак 2). Але асноўны галаўны ўбор і дзяўчат і жанчын - гэта хустка. Яна завязвалася “пад бараду”, “пад бабку”, “у вушкі” (“у рагі”), “пад барыню”, “зайчыкам” – найбольш складаная кампазіцыя з дзвюх хустак. Хусткі былі з тонкага палатна, вышываныя, пазней з’явіліся фабрычныя. Баваўняныя хускі называліся “бумажкамі”, шарсцяныя – “кашымеркамі”,” гарускамі”, вялікія хусткі называлі яшчэ “цыганкамі” - з тонкай чорнай воўны, з доўгімі махрамі і вышытымі буйнымі каляровымі кветкамі на рагу ззаду. Дзяўчаты насілі таксама і “касінкі” – невялікія касынкі з прышытай наперадзе вузкай паласой карункаў.У зімовы час жанчыны павязвалі зверху вялікую хустку ў клетку – “абпінаху” .

Завяршалі жаночы ўбор танныя ўпрыгожванні, пераважна маністы з рознакаляровага шкла. Упрыгожванняў больш было у дзяўчат, меньш - жанчын. Дзяўчаты насілі пярсцёнкі, завушніцы, у касу уплятаі доўгія рознакаляровыя стужкі, таксама накідвалі на плечы 2-3 стужкі, канцы пускалі спераду па грудзях. Нацельны крыж насіўся зверху маністаў, якія размяшчаліся на грудзях

радамі (“сталкамі”), ствараючы амаль цэльнае ўпрыгожванне. Ніткі самых буйных пацерак былі размешчаны па ніжнім краі, апошнія, дробныя, плотна ахоплівалі шыю. Дадзены касцюм мае агульныя рысы са строямі Чарнігаўшчыны, што абумоўлена даўнімі культурнымі і эканамічнымі сувязямі з Украінай (дадатак 2).

Яшчэ у 1920-30-я гг. па святах жанчыны і дзяўчаты абавязкова выходзілі на вуліцу з невялікімі (этыкетнымі) хустачкамі ў правай руцэ, з невялікімі букетамі кветак.

### 3.6. Верхняе адзенне і абутак

Да верхняга адзення адносіцца світка (асенне-вясенні перыяд) і кажушка. Світка была падобная да ўшваркі, але з рукавамі і больш доўгая. Пакрой, матэрыял і аздабленне падобнае да ушваркі. Існавалі больш лёгкая асенняя світка і падбітая ваціная зімовая (дадатак 3, мал. 17-22). У зімовы час асноўным адзеннем была кажушка, якая шылася з аўчыны, што фарбавалася дубовай карой і мела карычневы колер. Пакрой у кажушкі і світкі быў аднолькавы. Аздаблялася кажушка па краю рукава, каўнера і подолу аплікацыяй другога колеру, або палоскамі (дадатак 3, мал. 23-29).

Абутак жанчын не адрозніваўся разнастайнасцю: лапці, пасталы, буркі і святочны – боцікі-шнуроўкі, чобаты. Пасталы пляліся з ліпы, лазы або вяровак.

Такім чынам, можна адзначыць, што народны касцюм мясцовасці ўвабраў у сябе элементы як тыповага беларускага касцюма, так і ўкраінскага, і рускага, што тлумачыцца блізкім суседствам і гісторыяй узаемаадносін. Непасрэдная блізкасць да тэрыторыі Украіны абумовіла такія асаблівасці народнага касцюма, як расшыванне жаночай сарочкі і фартуха, крой ушваркі, яе рознакаляровасць, вышыўка, у якой пануюць не геаметрычныя, а раслінныя ўзоры, дзякуючы чаму адзенне нашых жанчын красавала сакавітымі фарбамі. Сюды можна аднесці і галаўны ўбор – вянок з лентамі. Пераніраліся спосабы ткацтва і ўпрыгожвання андаракаў. Уплыў усходняга суседства рускай культуры сказаўся на існаванні такога тыпу адзення як спадніца з нагруднікам, якая напамінае сарафан.

Хаця, не гледзячы на ўплыў суседніх народаў, касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа захаваў і чыста беларускія элементы. Па-першае, гэта дамініраванне белага колеру ў народным касцюме. Як і ва ўсёй Беларусі ў комплекс жаночага адзення ўваходзіла сарочка, спадніца (андарак), фартух, безрукаўка –“ушварка”.

Можна адзначыць, што народнае адзенне нашай мясцовасці адрозніваецца значнай разнастайнасцю прыёмаў і элементаў, яркасцю, у ім можна сустрэць рысы, характэрныя як для Падняпроўя, так і для Усходняга Палесся, бо тэрыторыя размешчана амаль на мяжы гэтых гісторыка-этнаграфічных раёнаў. Як і ў Падняпроўі, пры аздабленні жаночых сарочак выкарыстоўваюцца разнастайныя тыпы вышывак, у тым ліку такія прыёмы як мярэжка і вышыўка па ёй, разнастайныя зборкі, вышыўка на зборках, гафтаванне. Безрукаўка

(ушварка) была  часцей чорнага колеру, як у Буда-Кашалёўскім строі, а існаванне спадніцы з нагруднікам характэрна для  усходне-беларускіх строяў. У той жа час народны касцюм мясцовасці не ўступае строям Усходняга Палесся па багаццю фарб і сродках мастацкага афармлення касцюма. Расшытыя крыжыкам або гладдзю рукавы жаночых сарочак, фартухі, наяўнасць такога элемента адзення як плахта, з'яўленне разам з строгімі чорнымі "ушваркамі" і расшытых, сустракаецца ў суседніх усходнепалескіх строях. У нашай мясцовасці жанчыны часта насілі чырвоны, затканы знізу андарак, які характэрны для Чарнігаўшчыны.

Увогуле можна сказаць, што народны касцюм мясцовасці з'яўляецца сапраўдным увасабленнем узаемасувязі, узаемаабагачэння культур трох славянскіх народаў, дзякуючы чаму ў народным касцюме ўсходняй частке Гомельска-Чарнігаўскага памежжа прасочваецца пэўны рэгіянальны каларыт, і, на наш погляд, ёсць падставы для вылучэння асобнага паўднёва-гомельскага строю.

Багацце і разнастайнасць жаночага касцюма мясцовасці дазволіў распрацаваць экскурсію "Жаночы касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа", якая праводзіцца для вучняў Маркавіцкай і суседніх школ (дадатак 4).

**Заключэнне**

На аснове вывучэння жаночага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа пачатку XX ст. можна зрабіць наступныя вывады:

Жаночы касцюм мясцовасці па наяўнасці асноўных элементаў не адрозніваецца ад іншых строяў Падняпроўя і складаецца з сарочкі, наплечнага адзення – ушваркі, паяснога – андарака або спадніцы ці, радзей, плахты і фартуха, верхняга – світкі і кажушкі. Асноўным матэрыялам для вырабу адзення з'яўлялася даматканае ільняное палатно, сукно і паўсукно, пазней пашырылася выкарыстанне фабрычных тканін.

Найбольш складанай па асаблівасцях крою і аздаблення з'яўляецца сарочка. У нашай мясцовасці пашырана сарочка палікавага крою з каўняром стойкай. Самай багатай па майстэрству выканання і аздаблення з'яўляецца рукаў, асабліва яго верхняя частка (плячо). У месцы злучэння паліка і рукава на плячы раней шырока выкарыстоўваліся такія прыёмы, як мярэжка і вышыўка па ёй, гафтаванне, дэкаратыўнае аздабленне ўточных швоў. Пазней у гэтым месцы рабілася вышыўка, якая імітавала мярэжку або фестончатая зборка і адзначалася плотным вузкім вышытым бардзюрам ў выглядзе гірлянды з кветак, сцяблін і лісця. Разнастайным па афармленні ткацтва і вышыўкі з'яўляецца знешняе поле рукава. Раней гэта было бранае ткацтва з традыцыйным геаметрычным узорам, пазней разнастайная вышыўка – лікавая гладзь, вышыўка крыжыкам у чырвона-чорнай гаме. Рукаў святочнай сарочкі звычайна вышываўся поўнасцю кветкамі – ружамі, лілеямі, валошкамі, гронкамі вінаграду, таму для іх характэрна мясцовая назва " ў кветкі". Ніз рукава збіраўся ў складкі, часта заканчваўся "брыжамі" і ўпрыгожваўся вышыўкай на зборках, зборкамі "ў вафлі", пазней проста прышытай вузкай палоскай тканіны з вышыўкай. Край манжэта часта апрацоўваўся краявым накідам. Каўнер і ніз сарочкі аздабляліся сціпла, пераважна вышыўкай крыжыкам або працягам.

3. Паясное адзенне – андарак ткаўся " палоску", "у клетку" і ў нашай мясцовасці сустракаўся чырвоны андарак з затыканым унізе (або вышытам працягам) рознакаляровым геаметрычным узорам. Для яго вытыкаўся і вышываўся таксама чырвоны фартух – запаска. Больш пашыранай была спадніца і спадніца з прышытым ліфам – спадніца з нагруднікам. Радзей насілася несшытае адзенне – плахта, якая складалася з 2 або 3 кускоў тканіны, пышытых к поясу-завязцы. Давяршаў камплект разнастайны па аздабленні фартух з вышыўкай, карункамі, "брыжам" па краі. Звычайна ён быў белы, але сустракаўся шэры, чорны – запаска. Зверху завязваўся "вушкамі" пояс з махрамі або "кіціцамі".

Своеасаблівым кроем адрозніваецца безрукаўка "ушварка", які пры ўсёй строгасці буда-кашалёўскага строю быў больш упрыгожаны вышыўкай, аплікацыяй. Пазней "ушварка" шылася не толькі з чорнай, але і з рознакаляровай тканіны. Крой жаночага адзення, яго аздабленне падкрэслівалі

стройнасць і прыгажосць жаночага стану, прываблівалі яркасцю і багаццем вышыўкі і іншых сродкаў дэкаратыўных ўпрыгожванняў.

Завяршэнне жаночаму касцюму надаваў галаўны ўбор, які адрозніваўся ў дзяўчат і жанчын. Дзяўчаты ўпрыгожвалі галаву вянком з featuring рознакаляровымі лентамі, жанчыны насілі чапец, у які хавалі заплеценыя або скручаныя валасы. І дзяўчаты і жанчыны таксама насілі хусткі (хусты), якія завязвалі "пад бараду" ("у рагі"), "пад барыню", "пад бабку", "зайчыкам". Асноўныя ўпрыгожванні – бусы, танныя завушніцы, пярсцёнкі.

Верхняе адзенне – світка шылася з чорнага сукна, аздаблялася нязначнай вышыўкай па краю. Кажушка выраблялася і шылася з аўчыны, пераважна карычневага колеру з багатай аплікацыяй па краю, на пярэдняй пале, рукавах і над баскай. Зверху ў халады накідвалі вялікую хустку "абпінаху". Абутак жанчын быў звычайны для таго часу: лапці, пасталы, буркі і святочны – боцікі-шнуроўкі,боты (чобаты).

Жаночы касцюм поўдня Гомельскага раёна адрозніваецца значнай разнастайнасцю прыёмаў і элементаў, яркасцю, у ім можна сустрэць рысы, характэрныя як для Падняпроўя, так і для Усходняга Палесся, бо тэрыторыя размешчана амаль на мяжы гэтых гісторыка-этнаграфічных раёнаў, ён ўвабраў у сябе як традыцыўна беларускія элементы, характэрныя для Падняпроўя, так і элементы жаночага адзення Чарнігаўшчыны – чырвоны андарак з запаскай, яркія аздабленні і крой безрукаўкі "ушваркі", кветкавыя ўзоры на сарочках, галаўны ўбор дзяўчат – вянок з лентамі. Лакальная своеасаблівасць і ўнікальнасць жаночага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа, дае падставы вылучыць яго асобна сярод буда-кашалёўскага строю.

Багацце і разнастайнасць жаночага касцюма мясцовасці дазволіў распрацаваць экскурсію "Жаночы касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа", якая праводзіцца для вучняў Маркавіцкай і суседніх школ. Рэгіянальны каларыт жаночага адзення дазваляе шырока выкарыстоўваць яго элементы для аздаблення сучаснага адзення, дае магчымасць зрабіць яго больш непаўторным і прыгожым.

**Літаратура**


1. Віннікава М.М., Некаторыя асаблівасці традыцыйнага касцюма беларусаў Усходняга Палесся/ М.М. Віннікава //Палявая фалькларыстыка і этнаграфія. - Мн., 2008.
2. Живописная Россия/ Рэпрынтнае выданне 1882 г., том 3. - Мн.: Беларуская энцыклапедыя,1994.
3. Лобачевская, О.А. Белорусский народный косцюм. Крой, вышивка и декоративные швы/ О.А Лобачевская, З.И. Зимина - Мн.: Беларуская навука, 2013.
4. Кузьмич, А.В. Этнографическое наследие Гомельского района. Народный костюм, региональные особенности, проблемы сохранения/А.В. Кузьмич// Не исчезнет наследие веков. Материалы межрайонной научно-практической конференции «Сохранение народной традиционной культуры - основа развития современной культуры села»- Гомель, 2008.
5. Курилович, А. Н. Белорусское народное ткачество/А.Н. Курыловіч - Минск: Наука и техника, 1981.
6. Маленка, Л. І. Беларускі народны касцюм/ Л.І. Маленка - Мн: Ураджай, 2001.
7. 7. Ніколаева, Т. Історія українського костюма/ Т. Ніколаева - Київ: Либідь, 1996.
8. Малчанава, Л.А. Беларускае народнае адзенне/Л.А. Малчанава, Г.М. Курыловіч -Мн: Навука і тэхніка, 1975.
9. Раманюк, М. Беларускае народнае адзенне/ М. Раманюк - Мн: Беларусь, 1981.
10. Раманюк, М. Беларускія народныя строі/ М. Раманюк - Мінск: Славія, 2003.
11. Смірнова, І.Ю. Традыцыйны сялянскі касцюм в. Маркавічы і наваколля/ І.Ю. Смірнова//Не исчезнет наследие веков. Материалы межрайонной научно-практической конференции «Сохранение народной традиционной культуры - основа развития современной культуры села»- Гомель, 2008.
12. http://albi.tv.artikle/4044/belorusskiy-kostym
13. http://ru.wikipedia.org/wiki/Белорусский национальный костюм
14. http://etno.iatp.by. Этнология Беларуси. Лекция №10
15. http://incopolis.livejornal.com/Национальный костюм на карте Беларуси

**Дадатак 1. Спіс інфарматараў:**

Вёска Маркавічы

1. Белкіна Еўдакія Міхайлаўна, 1937 г.н.
2. Бобашава Ніна Паўлаўна, 1940 г. н.
3. Гарбачова Паліна Фёдараўна, 1933 г. н.
4. Мацукова Лідзія Васільеўна, 1927 г. н.
5. Пытлева Алена Фёдараўна, 1938 г. н.
6. Шыпкова Ніна Пятроўна, 1936 г.н.

Вёска Гадзічава

1. Басаў Рыгор Ціханавіч, 1972 г.н.
2. Басава Таццяна Сяргееўна, 1930 г. н.

Вёска Глыбоцкае

1. Сіманенка Ганна Аляксандраўна, 1938 г. н.

Вёска Рагі-Ілецкі

1. Сарокіна Анастасія Фядосаўна, 1923 г. н.

Вёска Займішча

1. Сяліцкая Таццяна Іванаўна, 1936 г.н.

## Дадатак 2. Жаночы сялянскі касцюм у пачатку XX стагоддзя









Мал. 1-4. Традыцыйны сялянскі касцюм в.в. Глыбоцкае, Маркавічы, Гадзічава

## Дадатак 3. Асноўныя элементы жаночага сялянскага касцюма Гомельска-Чарнігаўскага памежжа






Мал. 1-4. Святочнае жаночае адзенне: сарочка, андарак, фартух,ушварка, хустка



Мал. 5-7. Жаночы камплект: сарочка, спадніца, ушварка, фартух



Мал. 8-10. Спадніца з нагруднікам



Мал. 11-13. Спадніца з нагруднікам, спадніца, плахта, фартух. ушварка





Мал. 14-16. Андаракі





Мал. 17-19. Верхняе адзенне. Світка асенняя





Мал. 20-22. Верхняе адзенне.  Світка зімовая





Мал. 23-25. Верхняе адзенне. Кажушка, хустка-абпінаха






Мал. 27-29. Аздабленне кажушкі




Мал.5. Агульны выгляд сарочкі. Рыс. 6. Разнастайнасць рукава сарочкі



Мал. 7-9.Знешняе поле рукава: вышыўка крыжыкам, гладдзю, лікавай гладдзю



Мал. 10-11. Знешняе поле рукаваБранае ткацтва, вышыўка гладдзю, крыжыкам



Мал. 12-14. Знешняе поле рукава: вышыўка гладдзю, крыжыкам



Мал. 15-17. Сарочкі “у кветкі”




Мал. 18-19. Аздабленне верхняй часткі рукава. Мярэжка. Вышыўка па мярэжцы.




Мал. 20. Мярэжка і вышыўка

Рыс. 21. Мярэжка. Гафтаванне




Мал. 22, 23. Фестончатая зборка





Мал. 24,25. Зборка ўперад іголкай. Вышыўка на зборках. Краявы накід





Мал. 26. Фестончатая зборка (пуплы) Рыс. 27. Зборка “вафлі”





Мал. 28, 29. Манжэт “брыжам”. Вышыўка крыжыкам, краявы накід





Мал. 30-32. Аздабленне каўнера-стойкі. Вышыўка лікавай гладдзю, крыжыкам




Мал. 33, 34. Рэканструкцыя традыцыйнага сялянскага касцюма

## Дадатак 4. Тэхналагічная карта экскурсіі “Жаночы сялянскі касцюм Гомельска-Чарнігаўскага памежжа”

Тып экскурсіі: пазнавальная
Працягласць экскурсіі: 30 мінут
Мэта: пазнаёміць з асаблівасцямі жаночага сялянскага касцюма мясцовасці, яго ўнікальным рэгіянальным каларытам, выклікаць цікавасць да культурнай спадчыны свайго народа

| Этап | Аб’ект паказу | Час, мін | Асноўны змест экскурсіі |
|---|---|---|---|
| Уводзіны | Уваход у музей | 5 | Народнага жаночага касцюма – як адна з галоўных этнічных прыкмет матэрыяльнай культуры. |
| Асноўныя элементы жаночага касцюма | Камплект: сарочка, спадніца, ушварка, фартух | 5 | Асноўныя элементы жаночага касцюма мясцовасці і іх прызначэнне. |
| Нацельнае адзенне | Сарочкі | 10 | Асаблівасці крою жаночай сарочкі, прыёмы яе аздаблення |
| Паясное адзенне | Андарак, спадніцы, спадніцы з нагруднікам, фартух | 5 | Прызначэнне і асаблівасці крою, аздаблення паяснога адзення |
| Наплечнае адзенне | Ушваркі | 5 | Асаблівасці крою ушваркі, прыёмы яе аздаблення |
| Галаўныя ўборы, упрыгожванні | Галаўныя ўборы: вянкі, хусткі, чапец, фотаздымкі | 5 | Разнастайнасць і прызначэнне галаўных убораў |
| Верхняе адзенне | Світкі, кажушка | 5 | Асаблівасці крою, прызначэнне і аздабленне верхняга адзення |
| Дэфіле “Таечка” | Дэфіле ў рэканструянаваным жаночым адзенні | 5 | Прывабнасць і ўнікальнасць народнага строю Гомельска-Чарнігаўскага памежжа |